*УДК 37.016:[811.161.3:81’367]*

# СІСТЭМА ПРАКТЫКАВАННЯЎ ПА НАВУЧАННІ СІНТАКСІЧНЫМ НОРМАМ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

**І. Э. Саўко[1], У. П. Саўко[2]**

*[1] Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. К. Маркса, 31, 220030, г. Мінск, Беларусь, Inna1805@mail.ru*
*[2] Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка,*
*вул. Савецкая, 18, 220030, г. Мінск, Беларусь, vp.bspu@gmail.com*

Даецца апісанне сістэмы навучання сінтаксічным нормам беларускай літаратурнай мовы, якую мэтазгодна выкарыстоўваць ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі; прапануецца сістэма практыкаванняў па навучанні сінтаксічным нормам на ўроках беларускай мовы: практыкаванні на асэнсаванне вучнямі сутнасці сінтаксічных норм, практыкаванні на фарміраванне і ўдасканаленне ўменняў правільна ўтвараць сінтаксічныя адзінкі і ўжываць іх у маўленні, практыкаванні на фарміраванне ўменняў знаходзіць, класіфікаваць і выпраўляць памылкі, абумоўленыя парушэннямі сінтаксічных норм сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Прадстаўлены варыянты заданняў па кожным блоку практыкаванняў.

***Ключавыя словы:*** навучанне сінтаксічным нормам; сістэма практыкаванняў; граматычныя памылкі; сінтаксічныя памылкі.

# THE SYSTEM OF EXERCISES FOR TEACHING SYNTACTIC NORMS OF THE BELARUSIAN LITERARY LANGUAGE

**I. Savko[a], V. Savko[b]**

*[a] Belarusian State University,*
*K. Marx St., 31, 220030, Minsk, Belarus, Inna1805@mail.ru*
*[b] Maxim Tank Belarusian State Pedagogical University,*
*Sovetskaya St., 18, 220030, Minsk, Belarus, vp.bspu@gmail.com*

The description of the system of teaching syntactic norms of the Belarusian literary language, which is advisable to use in institutions of general secondary education, is given; a system of exercises for teaching syntactic norms in Belarusian language lessons is proposed: exercises for students to understand the essence of syntactic norms, exercises for the formation and improvement of skills to correctly form syntactic units and use them in the speech, exercises for the formation of skills to find, classify and correct errors caused by violations of syntactic norms of the Belarusian literary language. The variants of tasks for each block of exercises are presented.

***Key words:*** teaching syntactic norms; system of exercises; grammatical errors; syntactic errors.

Навучанне сінтаксічным нормам прадугледжана вучэбнымі праграмамі па беларускай мове для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. У прыватнасці, у XI класе разглядаюцца нормы дапасавання і кіравання, правілы сувязі выказніка і дзейніка, выражанага спалучэннем слоў, правілы пабудовы сказаў з аднароднымі членамі, ужывання дзеепрыслоўных зваротаў, пабудовы складаных сказаў [1, с. 6]. Нормы пабудовы канструкцый з чужой мовай вывучаюцца ў IX класе. У выніку вучні павінны ведаць акрэсленыя ў вучэбнай праграме сінтаксічныя нормы сучаснай беларускай мовы, захоўваць іх у маўленні, знаходзіць і выпраўляць у чужым і ва ўласным маўленні памылкі, абумоўленыя парушэннямі гэтых норм [1, с. 6].

Навучанне сінтаксічным нормам мэтазгодна ажыццяўляць у пэўнай сістэме, якая прадугледжвае: 1) азнаямленне з сінтаксічнымі нормамі; 2) фарміраванне ўменняў захоўваць сінтаксічныя нормы ў вусным і пісьмовым маўленні; 3) азнаямленне з тыпалогіяй памылак, абумоўленых парушэннямі сінтаксічных норм; 4) фарміраванне ўменняў знаходзіць, класіфікаваць і выпраўляць памылкі, абумоўленыя парушэннямі сінтаксічных норм.

Пэўны тэарэтычны і практычны матэрыял для рэалізацыі гэтай сістэмы ёсць у вучэбным дапаможніку па беларускай мове для XI класа [2]. Але сінтаксічныя нормы разглядаюцца ў ім сумесна з пунктуацыйнымі, таму пры падборы практыкаванняў асноўная ўвага скіроўваецца на ўдасканаленне пунктуацыйных уменняў і навыкаў. Напрыклад, у параграфе «Правілы пабудовы сказаў з аднароднымі членамі, знакі прыпынку» ёсць тэарэтычны матэрыял, прысвечаны адпаведным сінтаксічным нормам і парушэнням гэтых норм, але прапануецца толькі адно практыкаванне, звязанае з сінтаксічнымі нормамі, і пятнаццаць – з пунктуацыйнымі [2, с. 35–49].

Аднак фарміраванне ў вучняў уменняў захоўваць у маўленні сінтаксічныя нормы, знаходзіць і выпраўляць памылкі, абумоўленыя парушэннямі гэтых норм, таксама патрабуе значнай увагі і дастатковай колькасці практыкаванняў, якія прапануюцца і на ўроку, і для дамашняга выканання.

Гэтыя практыкаванні павінны ўяўляць сабой сістэму, якая можа ўключаць тры блокі заданняў: 1) на асэнсаванне вучнямі сутнасці сінтаксічных норм; 2) на фарміраванне і ўдасканаленне ўменняў правільна ўтвараць адпаведныя сінтаксічныя адзінкі і ўжываць іх у маўленні; 3) на фарміраванне ўменняў знаходзіць, класіфікаваць і выпраўляць

памылкі, абумоўленыя парушэннямі сінтаксічных норм сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Практыкаванні на асэнсаванне сутнасці пэўных сінтаксічных норм выкарыстоўваюцца адразу пасля азнаямлення вучняў з адпаведнымі правіламі пабудовы словазлучэнняў ці сказаў і могуць уключаць заданні на тлумачэнне моўнай з'явы і заданні на замацаванне тэарэтычнага матэрыялу.

Для тлумачэння моўнай з'явы прапануюцца правільна пабудаваныя словазлучэнні і сказы, а вучні павінны вызначыць, якім правілам рэгулюецца пэўная норма. Варыянты заданняў могуць быць, напрыклад, такія:

а) растлумачце, чаму азначэнні пры спалучэннях «лічэбнік + назоўнік» знаходзяцца ў форме назоўнага склону множнага ліку;

б) дакажыце, што прапанаваныя словазлучэнні пабудаваны згодна з нормамі кіравання ў беларускай мове;

в) дакажыце, што парныя злучнікі пры аднародных членах ужытыя правільна.

Практыкаванні на замацаванне ведання тэарэтычнага матэрыялу пажаданы таму, што большасць сінтаксічных норм рэгулюецца правіламі. Для такіх практыкаванняў больш за ўсё падыходзіць тэставая форма з класічнымі варыянтамі заданняў, напрыклад: адзначце правільныя сцверджанні, адзначце няправільныя сцверджанні. Можна даваць заданні і на дапаўненне выказвання. Правіла ў гэтых заданнях у залежнасці ад яго аб'ёму можа быць прадстаўлена поўнасцю і часткова, з прыкладамі і без іх.

Такія практыкаванні дапамогуць вучням зразумець, як знаходзіць «месца дзеяння» сінтаксічнай нормы, і засвоіць правілы, якія яе рэгулююць. Пры выкананні заданняў вучні маюць права звяртацца да вучэбнага дапаможніка, даведачных матэрыялаў і інш., што дазволіць папярэдзіць з'яўленне памылак і недакладнае засваенне тэарэтычнай інфармацыі.

Другі блок практыкаванняў накіраваны на фарміраванне і ўдасканаленне ўменняў правільна ўтвараць сінтаксічныя адзінкі і ўжываць іх у маўленні.

Для фарміравання і ўдасканалення ўменняў будаваць пэўныя словазлучэнні і сказы прапануюцца заданні з падкрэсленай нарматыўнай накіраванасцю, напрыклад:

а) утварыце словазлучэнні, улічваючы асаблівасці кіравання ў беларускай літаратурнай мове;

б) устаўце ў сказы парныя злучнікі так, каб яны звязвалі менавіта аднародныя члены сказа;

в) устаўце ў сказы дзеепрыслоўныя звароты, звяртаючы ўвагу на тое, што і асноўнае, і дадатковае дзеянне павінна адносіцца да адной і той жа асобы (прадмета);

г) перабудуйце сказы з простай мовай у сказы з ускоснай мовай, улічваючы вывучаныя сінтаксічныя нормы.

Матэрыялам для такіх заданняў з’яўляюцца словазлучэнні і сказы, што дазваляе папрацаваць з дастаткова вялікай колькасцю прыкладаў і накіраваць увагу вучняў менавіта на тую норму, якая разглядаецца.

Для фарміравання і ўдасканалення ўменняў ужываць вывучаныя сінтаксічныя адзінкі ў маўленні выкарыстоўваюцца не толькі сказы, але і тэксты. Гэта, безумоўна, займае больш часу, але дазваляе паказаць функцыянаванне пэўных тыпаў сказаў у звязным маўленні ў цеснай сувязі з іншымі кампанентамі моўнай сістэмы.

Фармулёўкі заданняў могуць быць, напрыклад, такія:

а) прывядзіце свае прыклады сказаў з деепрыслоўнымі зваротамі, ужытымі як у двухсастаўных, так і ў аднасастаўных безасабовых сказах;

б) перакладзіце тэкст з рускай мовы на беларускую;

в) выкарыстоўваючы сказы з аднароднымі членамі, вусна раскажыце пра тое, як у вашай сям’і рыхтуюцца да сустрэчы Новага года;

г) напішыце невялікі тэкст, выкарыстоўваючы ў ім розныя спосабы перадачы чужой мовы.

Трэці блок практыкаванняў садзейнічае фарміраванню ўменняў знаходзіць, класіфікаваць і выпраўляць памылкі, абумоўленыя парушэннямі сінтаксічных норм сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Перш чым перайсці да характарыстыкі гэтых практыкаванняў, неабходна звярнуць увагу на тое, як называць такія памылкі. Справа ў тым, што ў вучэбнай праграме і ў вучэбным дапаможніку па беларускай мове для 11 класа [1, 2] гэтыя памылкі называюцца сінтаксічнымі, а ў «Метадычных указаннях па арганізацыі кантролю і ацэнцы вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў...» яны кваліфікуюцца як граматычныя: «Граматычныя памылкі – гэта памылкі, дапушчаныя пры ўтварэнні слоў розных часцін мовы і іх форм, пабудове словазлучэнняў і сказаў, г. зн. парушэнні словаўтваральнай, марфалагічнай або сінтаксічнай норм» [3, с. 100]. На нашу думку, такія памылкі можна называць і сінтаксічнымі, паколькі парушаюцца менавіта сінтаксічныя нормы, і граматычнымі, таму што сінтаксіс з’яўляецца часткай граматыкі. Гэта пажадана сказаць і вучням, таму што пры праверцы творчых пісьмовых работ настаўнік пазначае парушэнні сінтаксічных норм літарай Г – граматычная памылка.

Найбольш частымі парушэннямі сінтаксічных норм беларускай літаратурнай мовы з’яўляюцца парушэнні норм кіравання, каардынацыі выказніка і дзейніка, выражанага колькасна-іменным спалучэннем, норм

пабудовы сказаў з аднароднымі членамі, з дзеепрыслоўнымі зваротамі, пабудовы складаназалежных сказаў і сказаў з чужой мовай. Каб вучні лепш зразумелі сутнасць сінтаксічных памылак, пры разглядзе кожнай сінтаксічнай нормы неабходна даць інфармацыю пра тыпалогію адпаведных памылак і спосабы іх выпраўлення.

Практыкаванні на знаходжанне, класіфікацыю і выпраўленне сінтаксічных памылак можна падзяліць на тры групы ў залежнасці ад таго, якія менавіта ўменні фарміруюцца ў вучняў у працэсе выканання заданняў.

Да першай групы адносяцца практыкаванні на супастаўляльны аналіз нормы і яе парушэнняў, на знаходжанне граматычных памылак: вучням прапануюцца правільна і няправільна пабудаваныя словазлучэнні і сказы і даецца заданне на іх размежаванне, напрыклад:

а) выпісаць сказы, у якіх не парушаны сінтаксічныя нормы;

б) адзначыць сказы з парушэннямі ўказаных сінтаксічных норм;

в) выбраць са слоў у дужках тыя, якія адпавядаюць пэўным правілам пабудовы словазлучэнняў ці сказаў, і інш.

Такія заданні вучні выконваюць, абапіраючыся як на вывучаныя сінтаксічныя нормы, так і на «моўнае чуццё», паколькі не патрабуецца вызначаць канкрэтны від памылкі.

У практыкаваннях другой групы прапануецца не толькі размежаваць правільны і няправільны варыянты, але і патлумачыць, якая менавіта норма парушана, напрыклад:

а) растлумачыць сутнасць парушэнняў сінтаксічных норм у прапанаваных прыкладах;

б) выпісаць сказы, у якіх не парушаны сінтаксічныя нормы, растлумачыць, чаму не падыходзяць астатнія прыклады;

в) адзначыць сказы з парушэннямі сінтаксічных норм, растлумачыць сутнасць парушэнняў;

г) выбраць са слоў у дужках тыя, якія адпавядаюць пэўным правілам пабудовы словазлучэнняў ці сказаў, абгрунтаваць свой выбар;

д) устанавіць адпаведнасць паміж сказамі і іх характарыстыкай з пункту гледжання парушэння сінтаксічных норм;

е) адзначыць сказы з парушэннямі менавіта сінтаксічных норм (даюцца сказы з парушэннямі і іншых норм: лексічных, фразеалагічных ці марфалагічных).

Заданні гэтага тыпу садзейнічаюць усвядомленаму аналізу пэўных сінтаксічных адзінак і прымяненню тэарэтычных ведаў на практыцы.

У практыкаваннях трэцяй групы неабходна знайсці, класіфікаваць і выправіць памылкі, выкліканыя парушэннямі сінтаксічных норм, напрыклад:

а) знайсці словазлучэнні, у якіх парушаны нормы кіравання, вусна выправіць памылкі;

б) адрэдагаваць сказы з сінтаксічнымі памылкамі;

в) знайсці сказы, у якіх парушаны названыя сінтаксічныя нормы, выправіць памылкі;

г) адзначыць сказы з парушэннямі сінтаксічных норм, растлумачыць сутнасць парушэнняў, адрэдагаваць сказы;

д) адрэдагаваць тэкст у адпаведнасці з сінтаксічнымі нормамі беларускай літаратурнай мовы.

Падобныя заданні дазваляюць фарміраваць уменні не толькі заўважаць сінтаксічныя памылкі, вызначаць іх сутнасць, але і, выпраўляючы іх, правільна будаваць выказванні.

Такім чынам, з мэтай навучання сінтаксічным нормам беларускай літаратурнай мовы неабходна паэтапна ўводзіць інфармацыю пра гэтыя нормы і тыпалогію сінтаксічных памылак, выкарыстоўваць сістэму практыкаванняў, накіраваных на аналіз правільна пабудаваных сінтаксічных адзінак, на знаходжанне, класіфікацыю і выпраўленне граматычных памылак, абумоўленых парушэннямі норм пабудовы словазлучэнняў і сказаў. Гэта будзе садзейнічаць развіццю граматычнага ладу маўлення вучняў, фарміраванню і ўдасканаленню іх нарматыўна-маўленчых уменняў і навыкаў.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1 Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для XI класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання (базавы ўзровень) [Электронны рэсурс]. URL: https://adu.by/images/2022/08/up-bel-mova-11kl.pdf (дата звароту: 05.01.2023).

2. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021.

3. Методические указания по организации контроля и оценки результатов учебной деятельности учащихся по учебным предметам при освоении содержания образовательных программ общего среднего образования, применению норм оценки результатов учебной деятельности учащихся по учебным предметам [Электронны рэсурс]. – URL: https://adu.by/ru/homepage/obrazovatelnyj-protsess-2022-2023-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie-2022-2023/3781-metodicheskie-rekomendatsii.html (дата звароту: 05.01.2023).